

**Грамовіч Ірына Міхайлаўна**
Кандыдат педагагічных навук, дацэнт,
дэкан факультэта музычнага мастацтва
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
культуры і мастацтваў

УДК 378.09:78]:378.4[008+7](476-25)

*І. М. Грамовіч*

# Адораная талентам моладзь – творчы патэнцыял факультэта музычнага мастацтва

*Выкладзены агляд набыткаў факультэта музычнага мастацтва ў галіне вучэбных методык, стварэння выканальніцкіх школ, засваення музычных ведаў у цеснай сувязі з практыкай, асаблівасцямі навучання і выхавання таленавітай творчай моладзі. Адзначана, што плён працы прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта найлепш ілюструюць творчыя лёсы выпускнікоў, якія рэалізаваліся ў прафесіі, з'яўляюцца шчырымі прыхільнікамі нацыянальнай культуры і яе прадстаўнікамі ў свеце.*

Факультэт музычнага мастацтва ажыццяўляе актыўную адукацыйную, вучэбна-педагагічную і канцэртна-творчую дзейнасць і мае на мэце яе высокую творчую якасць і годны прафесійны выканальніцкі ўзровень. Правядзенне канцэртаў, творчых праектаў, удзел у фестывалях і конкурсах – асноўныя паказчыкі працы факультэта, у якой задзейнічаны практычна ўсе студэнты і выкладчыкі. Факультэт музычнага мастацтва існуе з самага пачатку дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (у 1970-я гг. Мінскі інстытут культуры) і мае глыбокія і трывалыя традыцыі, свае выканальніцкія школы, методыкі выкладання, вучэбна-метадычныя распрацоўкі і навукова-даследчыя матэрыялы.

Сёлета спаўняецца 45 гадоў з дня існавання гэтай унікальнай установы вышэйшай адукацыі – падзея для самааналізу, самаацэнак вынікаў працы. Агляд здзейсненага за гэты час на факультэце музычнага мастацтва скіраваны на рэфлексіўную трактоўку здабыткаў мінулых, цяперашніх і праектных (будучых) распрацовак. Творчы характар працы факультэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

та музычнага мастацтва найперш вымагае берагчы традыцыі створанай на факультэце сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне народнай творчасці па напрамках духавой і народнай інструментальнай музыкі, харавых народных і акадэмічных спеваў, мастацтва эстрады па напрамках інструментальнага і эстрадна-джазавага выканальніцтва, сольных народных спеваў і духавых народных інструментаў і развіваць, удасканальваць музычнае мастацтва да ўзроўню патрабаванняў сучаснасці.

Эфектыўнасць працэсаў культурнага развіцця ў Беларусі звязана з ростам творчай актыўнасці асобы, павышэннем мастацкага ўзроўню, фарміраваннем прафесійных кампетэнцый. Дынамічныя працэсы ў культурным жыцці дзяржавы сведчаць аб неабходнасці своечасовага аналізу і падтрымкі існуючых інтэлектуальных рэсурсаў грамадства, сярод якіх цэнтральнае месца займае выхаванне адоранай, самадастатковай асобы, якая рэалізавалася ў творчай прафесіі. Падтрымка моладзі ў рэалізацыі сваіх магчымасцей з'яўляецца адным з прыярытэтных кірункаў у садзейнічанні дзяржаўнай маладзёжнай палітыцы.

Пры паступленні на спецыяльнасці факультэта абітурыенты трымаюць экзамен «Творчасць», на якім дэманструюць свае здольнасці і задаткі: музычныя, акцёрскія, вакальныя, танцавальныя, мастацкія, паказваюць тэарэтычныя веды ў галіне беларускага і сусветнага музычнага мастацтва і культуры. Перад педагогамі стаіць складаная задача: выявіць сярод прэтэндэнтаў самых таленавітых.

На сённяшні дзень на факультэце музычнага мастацтва склалася пэўная сістэма работы са студэнтамі: аб'яднанне іх у творчыя групы і вучэбныя калектывы, што пашырае магчымасці для развіцця іх таленту і здольнасцей, дапамагае сацыяльнай, псіхалагічнай адаптацыі, спрыяе прафесійнай арыентаванасці, матэрыяльнай падтрымцы.

Асаблівасці вучэбнага працэсу прадугледжваюць выкарыстанне разнастайнага па складанасці рэпертуару музычных і вакальных твораў, запатрабаваных на конкурсных праслухоўваннях, выяўленне прафесійных здольнасцей праз унутрыкафедральныя конкурсы і розныя праекты, індывідуальны падыход у навучанні, арганізацыю дадатковых заняткаў і рэпетыцый, актыўны ўдзел у канцэртнай дзейнасці, выкарыстанне самастойнай работы для развіцця і падтрымкі творчых ідэй.

У межах адукацыйнага працэсу студэнты маюць магчымасць наведваць майстар-класы і творчыя сустрэчы з вядомымі і знакамітымі замежнымі і айчыннымі музыкантамі, спевакамі і педагогамі, займацца ў гуртках і факультатывах, удзельнічаць у творчых калектывах, праходзіць канцэртна-рэпетыцыйную вытворчую і педагагічную практыку ў вядучых прафесійных і аматарскіх калектывах і вучэбных установах, ствараць свае аўтарскія аранжыроўкі, інструментоўкі і апрабіраваць іх на навукова-практычных канферэнцыях, экзаменах і канцэртах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Напрыклад, на кафедры народна-інструментальнай творчасці працуюць творчыя аб'яднанні па сольным выканальніцтве «Гармоніка» (кіраўнік – старшы выкладчык А. М. Валынец), ансамблевым выканальніцтве – «Мюзет» (кіраўнік – дацэнт Л. А. Сухаварава), дырыжыраванні – «Маэстра» (кіраўнік – старшы выкладчык Т. Д. Чэхоўская).

Крэатыўны патэнцыял моладзі на факультэце музычнага мастацтва рэалізуецца дзякуючы ўдзелу ў харавых і інструментальных калектывах кафедраў духавой музыкі, народна-інструментальнай творчасці, харавога і вакальнага мастацтва, беларускай народна-песеннай творчасці, мастацтва эстрады.

Духавы канцэртны аркестр «Светач» і Беларускі народны аркестр БДУКМ (мастацкі кіраўнік В. М. Валатковіч і галоўны дырыжор заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь А. У. Фёдараў) з'яўляюцца лаўрэатамі рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, штогод ствараюць цікавыя канцэртныя праграмы з твораў – шэдэўраў айчыннай і сусветнай класікі. Традыцыйным стаў праект «Музычная феерыя», дзе сваё дырыжорскае майстэрства дэманструюць студэнты кафедры духавой музыкі.

Капэла духавых інструментаў імя У. Грома «Гуды» пад кіраўніцтвам прафесара кафедры, дацэнта, кампазітара І. А. Мангушава – унікальны, адзіны ў рэспубліцы студэнцкі калектыў выканаўцаў на духавых народных інструментах. Гэта своеасаблівая лабараторыя па вывучэнні і захаванні выканальніцкіх традыцый. Арганізаваная таленавітым музыкантам Уладзімірам Громам капэла, названая яго імем, спрыяла стварэнню школы ігры на беларускіх народных духавых інструментах.

Акадэмічны хор «Дабравест» – лаўрэат мноства рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Да апошняга часу нязменным мастацкім кіраўніком з'яўлялася загадчык кафедры харавога і вакальнага мастацтва прафесар А. В. Пякуцька. Высокі ўзровень выканання, складаны рэпертуар духоўных песнапенняў, сучасныя і класічныя харавыя творы дазваляюць гэтаму калектыву быць запатрабаваным на прэстыжных канцэртных пляцоўках нашай краіны, бліжняга і далёкага замежжа. На сённяшні дзень эстафету кіравання хорам падхапіў старшы выкладчык кафедры І. В. Чардынцаў.

Маладзёжны эстрадна-сімфанічны аркестр на працягу свайго шматгадовага існавання праявіў сябе як высокапрафесійны музычны калектыў, які можа выконваць розную музыку: ад старажытнай да сучаснай. Дзякуючы прафесіяналізму мастацкага кіраўніка дацэнта кафедры мастацтва эстрады А. А. Кудзіна аркестр акампаніраваў вядомым прафесійным спевакам Беларусі, ствараў сольныя канцэрты для патрабавальных замежных гледачоў, а таксама выступаў своеасаблівым удзельнікам мюзікла «Дуброўскі». Струнная група аркестра з поспехам удзельнічала ў сучасных праектах з хорам кафедры харавога і вакальна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га мастацтва. У касцёле Святых Сымона і Алены прагучала Меса C-dur Франца Шуберта, а таксама «Credo» Генры Серокі з хорам кітайскіх студэнтаў «Садружнасць».

Нельга не адзначыць творчую дзейнасць аркестра рускіх народных інструментаў. Адметнасцю гэтага калектыву з'яўляецца адданасць традыцыйнай класічнай школе інструментальнага выканальніцтва. Мастацкі кіраўнік дацэнт кафедры народна-інструментальнай творчасці С. С. Авадок стварыў у аркестры ўмовы для апрабацыі аўтарскіх інструментовак студэнтаў, а таксама магчымасць набыцця практыкі сольнага спеву выканаўцам народнай песні.

Асаблівую ўвагу звернем на творчасць стыпендыята спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі ансамбля акардэаністаў «Туці» пад кіраўніцтвам дацэнта Л. А. Сухаваравай. Гэты невялікі па складзе (усяго 5 дзяўчат), мабільны інструментальны ансамбль мае самую вялікую колькасць перамог у рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. Багаты і разнастайны рэпертуар, віртуознае валоданне інструментам, высокае прафесійнае майстэрства і артыстызм дазволілі ім мець вялікую колькасць прыхільнікаў.

Сусветныя хіты, сучасныя эстрадныя творы ў рэпертуары струннага квартэта «Arco». Мастацкі кіраўнік дацэнт кафедры мастацтва эстрады Т. У. Дзяйко распрацавала сваю методыку навучання, спецыяльную тэхніку выканання штрыхоў, выкарыстання спецыфічнай палітры выразных музычных сродкаў. Студэнты ансамбля маюць магчымасць навучыцца навыкам імправізацыі, што вельмі каштоўна для музыканта-інструменталіста, які працуе ў жанры эстрадна-джазавага выканальніцтва.

Вакальны ансамбль «Універсум» дзякуючы свайму прафесіянальнаму выкананню складаных шматгалосых твораў набыў папулярнасць сярод гледачоў не толькі ў нашай краіне, але далёка за яе межамі. Эстрадна-джазавая манера спеву, неардынарная харызма, артыстызм набываюцца студэнтамі падчас рэпетыцыйнай работы і заняткаў з мастацкім кіраўніком старшым выкладчыкам кафедры мастацтва эстрады Т. М. Дробышавай.

Сапраўдныя захавальнікі нацыянальных песенных традыцый, дыпламанты і лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі студэнцкія калектывы кафедры беларускай народна-песеннай творчасці: фальклорны ансамбль «Грамніцы» (мастацкі кіраўнік прафесар кафедры У. К. Зяневіч), ансамбль песні і танца імя С. І. Дробыша «Валачобнікі» (мастацкі кіраўнік загадчык кафедры Л. Л. Ражкова), ансамбль салістаў «Беларуская песня» (мастацкі кіраўнік дэкан факультэта музычнага мастацтва І. М. Грамовіч). Высокаму прафесійнаму майстэрству, унікальным праграмам гэтых калектываў апладзіравалі гледачы Германіі, Аўстрыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галандыі, Вялікабрытаніі, Арабскіх Эміратаў, Францыі, Карэі, В'етнама, Польшчы, Літвы, Латвіі, Украіны, Расіі, ЗША.

Інструментальны ансамбль «Баламуты», створаны дацэнтам кафедры народна-інструментальнай творчасці В. І. Трамбіцкай, мае на мэце захаванне і прапаганду беларускай народнай інструментальнай музыкі. Пасля перадачы эстафеты кіраўніка старшаму выкладчыку кафедры народна-інструментальнай творчасці К. С. Трамбіцкаму пашырыўся і ўзбагаціўся рэпертуар, з'явіліся новыя музычныя інструменты, інструментальныя нумары набылі тэатралізаваную афарбоўку, студэнтам спатрэбіліся навыкі акцёрскага майстэрства. Калектыў імкнецца збіраць і вывучаць музычны фальклор і як мага дакладна захоўваць манеру выканання беларускай народнай музыкі, стылістыку і выканальніцкае майстэрства.

Факультэт музычнага мастацтва з улікам змяненняў у галіне адукацыі распрацаваў вучэбныя праграмы для замежных студэнтаў, сярод якіх студэнты з Кітайскай Народнай Рэспублікі. Музычная адукацыя вельмі запатрабаваная ў гэтай краіне. Такое вучэбнае і творчае ўзаемадзеянне паспрыяла стварэнню інтэрнацыянальных творчых студэнцкіх калектываў: інструментальнага ансамбля «Забава International» пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры народна-інструментальнай творчасці дацэнта В. А. Немцавай і акадэмічнага хору кітайскіх студэнтаў «Садружнасць» пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры харавога і вакальнага мастацтва дацэнта Г. А. Нячай. Вынікі сумеснай работы – цікавыя канцэртныя праграмы, распачатая разнастайная і плённая сумесная творчая дзейнасць. З поспехам калектывы бяруць удзел у канцэртных мерапрыемствах, якія ладзіць пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі з нагоды дзяржаўных свят, кітайскага Новага года у дабрачынных і прэстыжных дзяржаўных мерапрыемствах у Беларусі.

Унікальнай сучаснай формай работы са студэнтамі сталі пастаноўкі мюзіклаў на музыку К. Брэйтбурга «Дуброўскі» і «Казанова», а таксама агульны праект з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі «Сем таямніц Беларусі» (рэж. А. Д. Вавілаў).

Вынікамі работы з адоранымі, таленавітымі студэнтамі факультэта з'яўляюцца не толькі выдатныя адзнакі на экзаменах, але галоўнае – перамогі на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах.

Калектывы і сольныя выканаўцы рэалізоўваюць свой творчы патэнцыял на такіх прэстыжных фестывалях і конкурсах, як міжнародны фестываль-конкурс «Баян. Аккордеон. Гармоника» (г. Масква), расійска-беларускі адкрыты студэнцкі агляд-конкурс «Как на речке было на Фонтанке» (г. Санкт-Пецярбург), конкурс эстраднай песні «Белазаўскі акорд» (г. Жодзіна), конкурс выканаўцаў эстраднай песні ў межах X Маскоўскага міжнароднага фестывалю славянскай музыкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міжнародны фестываль «Молодежь – за Союзное государство» (г. Растоўна-Доне, Расія), рэспубліканскі радыёконкурс маладых выканаўцаў «Маладыя таленты Беларусі» (г. Мінск), міжнародны конкурс-фестываль «Нарва зажигает звезды», (г. Талін, Эстонія), рэспубліканскі фестываль-конкурс маладых выканаўцаў на ўдарнай устаноўцы «Барабанны біт» (г. Мінск), адкрыты міжрэгіянальны конкурс музыкантаў-выканаўцаў і інструментальных ансамбляў «ГАРА» (г. Варонеж, Расія), рэспубліканскі фестываль-конкурс «Спадчына» (г. Мінск), міжнародныя конкурсы «Дельфийские игры», «Рождественские ассамблеи» (г. Санкт-Пецярбург), выканаўцаў на народных інструментах «Малахитовая шкатулка», міжнародныя фестывалі «Казачья столица» (г. Масква), «Фольклорные вдохновения» (г. Лодзь, Польшча), Усерасійскія асамблеі аркестрава-харавых ансамбляў (г. Масква), міжнародны конкурс «Візерунки Прикарпаття» (г. Драгобыч, Украіна), міжнародны творчы форум-конкурс мастацтваў «Петербургская весна» (г. Санкт-Пецярбург), рэспубліканскі фестываль-конкурс харавой музыкі «Пеўчае поле», міжнародны фестываль музычнага мастацтва «Звіняць цымбалы і гармонік» (г. Паставы) і інш.

Асобае месца ў спісе конкурсаў займае расійска-беларускі адкрыты студэнцкі агляд-конкурс «Как на речке было на Фонтанке». Конкурс з'яўляецца ўнікальным інавацыйным адукацыйным праектам па падтрымцы, развіцці і прапагандзе народнага песеннага мастацтва, які спалучае формы канцэртна-выканальніцкай практыкі і дэманстрацыі творчых дасягненняў. Калектывы кафедры народна-песеннай творчасці «Валачобнікі», «Грамніцы» і «Беларуская песня», а таксама салісты-вакалісты – пастаянныя ўдзельнікі значнага для нас конкурсу. Калектывы кафедры годна вытрымалі канкурэнцыю і атрымалі званне лаўрэатаў I ступені: «Валачобнікі» ў 2013 г., «Беларуская песня» ў 2014 г. і 2019 г., ансамбль «Грамніцы» – Гран-пры, 2015 г. Высока ацаніла міжнароднае журы майстэрства нашых салістаў-вакалістаў: лаўрэатамі сталі Вікторыя Катлярова, Марына Путнікава, Крысціна Лагвінец, Таццяна Русак (I ступені), Ірына Чубікава, Маргарыта Гарбачова, Анжэліка Дашкевіч, Павел Юхневіч, Вадзім Казак (II ступені).

Кафедра мастацтва эстрады з'яўляецца адзінай у Беларусі, дзе навучаюцца эстрадна-джазавыя спевакі-салісты. Студэнты кафедры пастаянна павышаюць сваё прафесійнае майстэрства. Дзякуючы ўдзелу ў конкурсах іх імёны становяцца папулярнымі яшчэ ў гады вучобы. Напрыклад, Ягор Шаранкоў пераможца рэспубліканскага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні «Маладзечна – 2013» – лаўрэат III ступені; на міжнародным фестывалі «Молодежь – за Союзное государство» (2015) атрымаў Гран-пры; у 2017 г. на XXVI міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск – 2017» стаў лаўрэатам II ступені.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сёння ён – саліст заслужанага калектыву Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.

Валерыя Грыбусава на конкурсе маладых выканаўцаў беларускай эстраднай песні «Маладзечна – 2013» атрымала Гран-пры, на XXIV міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск – 2015» стала лаўрэатам I ступені. Яна з'яўляецца пераможцам нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне-2020».

Курчыч Яўгеній стаў лаўрэатам III ступені конкурсу маладых выканаўцаў «Віцебск – 2018», лаўрэатам міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, ён – стыпендыят і ўладальнік гранд-прэміі (2019) спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Запека Елізавета на рэспубліканскім конкурсе маладых выканаўцаў эстраднай песні «Маладзечна–2014» атрымала званне лаўрэата II ступені; на V рэспубліканскім фестывалі песні імя Ганны Герман «Эўрыдыка» (2017) узнагароджана спецыяльным дыпломам.

Ламака Наталля на XIV рэспубліканскім конкурсе маладых эстрадных выканаўцаў «Белазаўскі акорд» (2015) атрымала спецыяльны прыз ад радыё «Мінская хваля», на V рэспубліканскім творчым радыёконкурсе «Маладыя таленты Беларусі» (2015) – спецыяльны прыз «За творчы пошук», на IX міжнародным фестывалі «Молодежь – за Союзное государство» (2014) стала лаўрэатам III ступені.

Войтуль Лізавета на V рэспубліканскім творчым радыёконкурсе «Маладыя таленты Беларусі» (2015) атрымала спецыяльны прыз «За творчы пошук», на рэспубліканскім конкурсе маладых выканаўцаў эстраднай песні «Маладзечна–2015» стала лаўрэатам II ступені.

Зданюк Іван на XXVIII міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск – 2019» стаў лаўрэатам II ступені.

Бажко Дыяна на XIV міжнародным фестывалі «Молодежь – за Союзное государство» атрымала дыплом III ступені.

Кравец Вікторыя ў 2015 г. на V рэспубліканскім творчым радыёконкурсе «Маладыя таленты Беларусі» атрымала дыплом II ступені.

Хмяльніцкая Дар'я ў 2014 г. стала лаўрэатам I ступені рэспубліканскага творчага радыёконкурсу «Маладыя таленты Беларусі», у 2014 г. стала лаўрэатам III ступені (бронзавы медаль) на I адкрытых маладзёжных Еўрапейскіх Дэльфійскіх гульнях (г. Валгаград, Расія), у 2014 г. – лаўрэатам II ступені на конкурсе выканаўцаў эстраднай песні на міжнародным фестывалі «Молодежь – за Союзное государство», у 2014 г. – лаўрэатам II ступені на IV рэспубліканскім творчым радыёконкурсе «Маладыя таленты Беларусі».

Канцэртную дзейнасць творчых калектываў факультэта паспяхова каардынуе прадзюсарскі цэнтр «Арт-мажор». Самы вядомы праект



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэнтра – фестываль «Арт-мажор», які ўжо на працягу 26 гадоў дазваляе прадэманстраваць гледачам вынікі працы факультэта за вучэбны год. Эфектыўнай формай можна лічыць канцэртны праект кафедры духавой музыкі «Музычная феерыя», рэспубліканскія конкурсы выканаўцаў народнай песні «Жывая крыніца» і «Галасы Радзімы», арганізаваныя кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці.

Вялікую ролю ў актывізацыі работы з таленавітай моладдзю ўстаноў прафесійнай адукацыі ў нашай краіне аказвае спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, работа якога накіравана на стымуляванне інтэлектуальна-творчай дзейнасці моладзі ў галіне адукацыі, навукі і культуры. Створаны ў краіне электронны рэспубліканскі банк даных адоранай моладзі дае магчымасць прасачыць кар'ерны рост выпускнікоў факультэта, іх творчы лёс, своечасова і адрасна на дзяржаўным узроўні аказваць падтрымку маладым таленавітым спецыялістам.

Для заахвочвання студэнтаў факультэта музычнага мастацтва ва ўніверсітэце прызначаюцца таксама імянныя стыпендыі: імя М. А. Каралькова, імя І. Жыновіча, імя У. Мулявіна.

Лепшыя традыцыі музычнай педагогікі, навуковай і вучэбна-метадычнай дзейнасці закладваюцца намаганнямі таленавітых, адданых сваёй прафесіі выкладчыкаў, якія на ўласным прыкладзе паказваюць значэнне глыбокіх ведаў, годных асабовых якасцей, яснае разуменне ролі нацыянальнай культуры як гаранта незалежнасці краіны. Традыцыі, закладзеныя такімі выдатнымі выкладчыкамі, як М. М. Салдатаў, С. І. Дробыш, В. А. Новікаў, А. В. Пякуцька, Я. М. Рэутовіч, працягваюць кіраўнікі кафедраў, выкладчыкі, кандыдаты навук, дацэнты і прафесары факультэта: В. М. Валатковіч, В. В. Бартноўскі, Н. І. Дожына, Л. Л. Ражкова, Г. А. Нячай, Л. В. Снапкова, С. Ф. Войцік, Р. Р. Каленька, Т. М. Дробышава, В. А. Немцава, Л. К. Валасюк, Г. А. Быстроў, С. К. Ярохіна, С. С. Авадок, А. А. Кудзін, А. У. Фёдараў і інш.

Факультэт ганарыцца сваімі выпускнікамі: заслужанымі артыстамі В. Дайнекам, І. Дарафеевай, І. Пенем, Н. Раманскай, Н. Тамелай, Г. Радзько, А. Крамко, заслужанымі дзеячамі мастацтваў В. Ф. Гладкай, М. У. Сацурай, папулярнымі выканаўцамі Жанет, Ю. Вашчуком (Тэо), Л. Грыбалёвай, Д. Карпінчыкам (Германам), В. Кірыленка, П. Смолавай, В. Альшанскай, В. Рыжыкавай, Д. Максімовічам, Я. Курчычам, А. Шэўчык, кандыдатамі навук, дацэнтамі (у шэрагу якіх і аўтар гэтага артыкула) – Л. Л. Ражковай, В. І. Раманенкавай, А. Л. Шэдавай, І. М. Лісоўскай, прафесарамі кафедраў У. К. Зяневічам, А. В. Карацеевым і інш.

Увогуле вучэбна-адукацыйная дзейнасць факультэта музычнага мастацтва, узровень навучання і прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў дазволілі заваяваць прызнанне і аўтарытэт сярод спецыялістаў і глядацкай аўдыторыі. Аб гэтым сведчыць важкі факт: значны шэраг

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

выпускнікоў факультэта – гэта вядомыя ў краіне і за яе межамі музыканты і выканаўцы, выкладчыкі, кіраўнікі аматарскіх і прафесійных калектываў, тэлевядучыя, дзяржаўныя дзеячы. А калектыў педагогаў факультэта знаходзіцца ў заўсёдным пошуку новых, адпаведных сучаснаму этапу форм і зместу сваёй працы.

*I. Hramovich*

**Talented youth is a creative potential of the Faculty of musical art**

*An overview of the acquisitions of the Faculty of musical art in the field of educational methods, the creation of performing schools, the development of musical knowledge in close connection with the practice, the features of training and education of talented creative youth is presented. It is noted that the results of the work of the Faculty's teaching staff illustrate the creative destinies of its graduates who are self-realized in the profession, and are sincere supporters of national culture and its representatives in the world.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 11.05.2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ